## Прыёмы грамадзян

**10 верасня 2024 г. члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у Гродзенскай вобласці.**

У гэты дзень парламентарыі наведаюць усе раёны рэгіёна, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць просьбы, прапановы і скаргі, па магчымасці акажуць садзейнічанне ў вырашэнні хвалюючых пытанняў.

Традыцыйна людзей чакаюць у выканкамах:

• **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Качанава Наталля ІВАНАЎНА** — з 11.00 у Іўеўскім райвыканкаме (г. Іўе, пл. Камсамольская, 1; тэлефоны для запісу: 8 017 328 53 24, 8 017 323 93 33);

• **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ЗАЯЦ Леанід Канстанцінавіч** — з 11.00 у Навагрудскім райвыканкаме (г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, 11; тэл. для запісу: 8 0159 74 26 39);

• **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч** — з 11.00 у Мастоўскім райвыканкаме (г. Масты, плошча Леніна, 3; тэл. для запісу: 8 0151 56 13 04);

• **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах ТАТАРЫНОВІЧ Уладзіслаў Вікенцьевіч** — з 11.00 у Дзятлаўскім райвыканкаме (г. Дзятлава, вул. Леніна, 18; тэл. для запісу: 8 0156 36 12 51, 8 017 327 25 27);

• **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах БАЙКО Валянцін Валянцінавіч** — з 10.00 да 12.00 у Бераставіцкім (г. п. Вялікая Бераставіца, пл. Ратушная, 1; тэл. для запісу: 8 0151 17 58 37) і з 13.00 да 15.00 у Свіслацкім (г. Свіслач, пл. К. Маркса, 4; тэл. для запісу: 8 0151 37 71 73) райвыканкамах;

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве ЖАМОЙДА Андрэй Пятровіч** — з 10.00 да 12.00 у Воранаўскім (г. п. Воранава, вул. Савецкая, 34; тэл. для запісу: 8 0159 42 22 55, 8 0159 42 12 73) і з 14.00 да 16.00 у Лідскім (г. Ліда, вул. Савецкая, 8; тэл. для запісу 8 0154 53 40 30) райвыканкамах;

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ЖУК Ігар Георгіевіч** — з 10.00 да 12.00 у Астравецкім (г. Астравец, вул. К. Маркса, 2; тэл. для запісу 8 0159 12 86 10) і з 13.00 да 15.00 у Смаргонскім (г. Смаргонь, вул. Леніна, 5; тэл. для запісу 8 0159 23 76 57) райвыканкамах;

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ЗАХАРЧУК Дзмітрый Іванавіч** — з 11.00 да 13.00 у Ашмянскім райвыканкаме (г. Ашмяны, вул. Савецкая, 103; тэл. для запісу 8 0159 32 21 32);

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ІВАНОЎ Алег Вітальевіч** — з 10.00 да 13.00 у Шчучынскім райвыканкаме (г. Шчучын, пл. Свабоды, 11; тэл. для запісу: 8 0151 42 01 96, 8 0151 42 15 38);

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах АШУРЫК Павел Станіслававіч** — з 11.00 да 13.00 у Зэльвенскім (г. п. Зэльва, вул. 17 Верасня, 29; тэл. для запісу: 8 0156 47 29 14, 8 0156 43 29 63) і з 14.00 да 16.00 у Слонімскім (г. Слонім, вул. Чырвонаармейская, 40; тэл. для запісу 8 0156 22 71 77) райвыканкамах;

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах СТАЛЬБОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна** — з 11.00 у Ваўкавыскім райвыканкаме (г. Ваўкавыск, вул. Дзяржынскага, 3; тэл. для запісу 8 0151 25 13 19);

• **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці ЯНУШКА Андрэй Вячаслававіч** — з 10.00 у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Гродна (г. Гродна, вул. Гагарына, 18/2; тэл. для запісу 8 0152 49 06 91.

• 9 верасня 2024 г. з 11.00 да 14.00 **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ХАМЕНКА Сяргей Мікалаевіч** правядзе прыём грамадзян у Карэліцкім райвыканкаме (г. п. Карэлічы, пл. 17 Верасня, 9; тэлефон для запісу 8 0159 62 12 55).

**Папярэдні запіс ажыццяўляецца 3 і 5 верасня з 11.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00.**

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

## Адкрыты новы комплекс будынкаў Мінскага мастацкага каледжа

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўрачыста адкрыў новы комплекс будынкаў з інтэрнатам Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава, паведаміла БелТА.**




У час урачыстай лінейкі Раман Галоўчанка павіншаваў навучэнцаў з пачаткам новага навучальнага года: «Разам з вамі гэтае свята па ўсёй краіне адзначаюць амаль два мільёны школьнікаў і студэнтаў. Ну і, вядома, першакласнікі, якія ўпершыню сёлета сядуць за парты. Іх у нас 105 тысяч. Першакурснікаў таксама шмат. У каледжы і ВНУ ўпершыню прыйшлі больш як 100 тысяч навучэнцаў».

Перад навучэнцамі каледжа расчыніў свае дзверы новы будынак. «Прасторнае памяшканне напоўніцца вашымі галасамі, вашымі ўсмешкамі, ну і, вядома ж, той атмасферай творчасці і натхнення, якую вы самі для сябе і ствараеце», — упэўнены прэм'ер. Дзяржава сапраўды нямала робіць для сферы адукацыі, заўважыў Раман Галоўчанка. «Толькі за апошнія некалькі гадоў пабудавана больш за 60 новых школ і дзіцячых садоў. Сваю работу пачалі яшчэ пяць школ і тры дзіцячыя садкі на 5,5 тысячы месцаў. Адкрываецца новы інтэрнат Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры. Да канца года новы інтэрнат атрымае і БНТУ. Ну і цудоўны падарунак атрымлівае сфера культуры — мы адкрываем цэлы комплекс будынкаў з інтэрнатам Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава. Пабудаваны ён на тым самым месцы, дзе знаходзіўся з 1947 года. Значыць, слаўная гісторыя каледжа будзе прадоўжана», — з упэўненасцю адзначыў кіраўнік урада.

На будаўніцтва комплексу затрачана звыш Br37 млн бюджэтных сродкаў. Па словах прэм'ера, гэта быў няпросты праект са складанай гісторыяй. «Тым не менш мы адшукалі магчымасць і апаратыўна завяршылі гэты найважнейшы для нашай культуры аб'ект. Таму што, інвестуючы сюды, інвестуючы ў культуру, адукацыю, мы, вядома ж, інвестуем і ў будучыню нашай краіны. Гэта вельмі важна», — падкрэсліў прэм'ер.

У будынку светлыя аўдыторыі, майстэрні з сучасным абсталяваннем, спартыўная, актавая залы і ўтульны інтэрнат. «Спадзяюся, што ўсё гэта вас яшчэ дадаткова прастымулюе да дасягнення высокіх вынікаў у вучобе. Ваш каледж — гэта адна са знакавых для нашай краіны навучальных устаноў. У яго сценах вучаліся многія з тых людзей, якія сваёй творчасцю праславілі Беларусь. Спадзяюся, што вы працягнеце гэтыя слаўныя традыцыі. Не бойцеся ставіць перад сабой амбіцыйныя мэты. Вас ніхто не будзе абмяжоўваць у вашых творчых пошуках, творчасці. Будзьце вернымі сабе і свайму пакліканню. Для вас адкрыты свет, і дзякуючы сваім талентам вы зможаце яго заваяваць. Я ў гэта вельмі веру», — даў наказ Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр уручыў кіраўніцтву каледжа сертыфікат на камфартабельны мікрааўтобус МАЗ 281040. Акрамя таго, кіраўнік урада асабіста азнаёміўся з інтэр'ерам новых будынкаў і іх функцыяналам. Так, у навучальным корпусе размешчаны аўдыторыі і майстэрні, кабінеты для выкладчыкаў, харчаблок, гардэробная, спартыўная і актавая залы. У спартыўнай зале навучэнцы і выкладчыкі змогуць гуляць у валейбол, гандбол, баскетбол. Знойдзецца месца і для настольнага тэніса. Актавая зала разлічана на 120—130 месцаў.

### У тэму

Для мадэрнізацыі будынка Акадэміі музыкі будзе выдзелена больш як Br4 млн. Аб гэтым расказаў **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** перад адкрыццём новага комплексу будынкаў з інтэрнатам Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава.

Міністр адзначыў, што выпускнікі мастацкага каледжа запатрабаваны не толькі ўнутры краіны. На іх з прыцэлам глядзяць і замежныя партнёры. «Гэта сведчыць аб высокай якасці сістэмы адукацыі ў сферы культуры, таму што чалавек творчы заўсёды нясе ў сабе пазітыў, выдатны настрой і робіць так, каб наша цудоўная краіна была яшчэ прыгажэйшай», — упэўнены Анатоль Маркевіч.

Адкрыццё будынкаў каледжа — яскравы прыклад адносін дзяржавы да сферы культуры, такіх прыкладаў вельмі шмат па Беларусі, адзначыў Анатоль Маркевіч. «Сёлета абноўлены школы мастацтваў, праведзены капітальныя рамонты сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы таксама набылі асаблівы змест, — падкрэсліў міністр. — Акадэмія музыкі — флагман сферы адукацыі ў культуры — таксама будзе капітальна адрамантавана. Мы бачым, што такія ўмовы стымулююць вучняў да дасягнення добрых вынікаў».

Каб памяталі

# НЕПЕРАМОЖАНЫ



Учора не стала чалавека-легенды. Памёр Аляксандр Мядзведзь, ён пайшоў ад нас на 87-м годзе жыцця.

...26 жніўня 1972 года. Федэратыўная Рэспубліка Германія, Мюнхен. Olympiastadion: 52 гады назад тут адбылося ўрачыстае адкрыццё гульняў XX Алімпіяды. Сабралася рэкордная колькасць удзельнікаў і нацыянальных каманд. Адно з самых унушальных прадстаўніцтваў — у Савецкага Саюза — 373 атлеты. На чале калоны савецкіх спарсменаў ішоў беларускі барэц вольнага стылю, двухразовы (на той момант) алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь, ён нёс сцяг дзяржавы.

Шлях да трэцяга залатога медаля быў у яго непросты. Чаго вартая, напрыклад, перамога над 200-кілаграмовым амерыканцам Крысам Тэйларам (сам Мядзведзь тады важыў «усяго» 107 кг). У фінальным паядынку яму супрацьстаяў балгарын Асман Дураліеў. «Асман мне кажа, маўляў, Сашок, я сыходжу, дай мне выйграць». А я адказваю: «Асман, я ж таксама сыходжу», — успамінаў той масант Аляксандр Васільевіч. Да апошняга імгнення Мядзведзь застаўся верны сабе і атрымаў перамогу. Пасля таго, як суддзя ўзняў яго руку, Мядзведзь пакланіўся гледачам, стаў на калені і пацалаваў барцоўскі дыван, з якога сышоў непераможаным.

Вядома, шкада было расставацца. Да слёз. Аляксандр Мядзведзь ведаў, што гэта апошняя Алімпіяда. Як бывае ў спартсменаў: трэніруешся да сёмага поту, змагаешся, усяго сябе аддаеш (інакш нельга), а потым быццам усё страціў... Тут галоўнае — знайсці сабе справу і ісці далей. Інакш можаш зламацца. Бо спартсмены на працягу многіх гадоў жывуць толькі спаборніцтвамі і перамогамі. Пасля Мядзведзю прапаноўвалі пераехаць у Амерыку. Але Аляксандр Васільевіч застаўся тут, у Беларусі, у Мінску. Тут сфарміраваўся як асоба. Атрымаў усё: вышэйшую адукацыю, Дзяржаўную прэмію, прафесарскае званне. Быў прызнаны найлепшым беларускім спартсменам XX стагоддзя.

Аляксандр Васільевіч шмат і плённа працаваў у якасці трэнера зборнай каманды БССР і СССР. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле беларускія барцы вольнага стылю дабіліся высокіх спартыўных вынікаў: станавіліся чэмпіёнамі СССР, пераможцамі Кубкаў свету сярод дарослых, чэмпіёнамі Еўропы, чэмпіёнамі свету... У ліку чэмпіёнаў і сын Мядзведзя, Аляксей.

Аляксандр Мядзведзь — жывы прыклад таго, як праца, самаахвярнасць і імкненне да дасканаласці могуць прывесці да самых высокіх вынікаў. Гісторыя найлепшага барца вольнага стылю свету натхняе многія тысячы людзей змагацца за свае мары і не адступаць перад цяжкасцямі.

«Не зайздросці, не раскісай, не шукай прычын сваіх няўдач на баку» — запаведзь Аляксандра Мядзведзя.

Будзем памятаць пра гэта.

Бывайце, Аляксандр Васільевіч...

**Звяздоўцы.**

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім заслужанага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера БССР і СССР, шматразовага чэмпіёна свету і Алімпійскіх гульняў Аляксандра МЯДЗВЕДЗЯ.**

**«Прыміце шчырыя спачуванні ў сувязі са смерцю легенды сусветнага спорту Аляксандра Васільевіча Мядзведзя. Пайшоў з жыцця вялікі атлет, трэнер, грамадскі дзеяч у гісторыі спорту», — гаворыцца ў спачуванні.**

**Прэзідэнт падкрэсліў, што Аляксандр Мядзведзь усяго сябе прысвяціў служэнню роднай Беларусі, зрабіў неацэнны ўнёсак у развіццё нацыянальнай школы барацьбы і алімпійскага руху.**

**«У памяці беларускага народа Аляксандр Васільевіч назаўжды застанецца як увасабленне сілы, мудрасці і патрыятызму», — падкрэсліў беларускі лідар.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю МЯДЗВЕДЗЯ Аляксандра Васільевіча, заслужанага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера БССР і СССР, шматразовага чэмпіёна свету і Алімпійскіх гульняў, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Падзяляем цалкам горыч гэтай незаменнай страты.**

**Светлая памяць пра Аляксандра Васільевіча назаўсёды захавaецца ў нашых сэрцах.**